# КІНААКТРЫСА ПА ІМЕНІ РЫГА

## ЯК ЛАТВІЙСКАЯ СТАЛІЦА БЫЛА ПАВІЛЬЁНАМ «БЕЛАРУСЬФІЛЬМА»

**Рыга нібы незнаёмка — прывабная і адначасова таямнічая. Нават пра ўзрост горада цяжка сказаць штосьці пэўнае: тры хронікі называюць розныя даты, а археолагі ў гэтае пытанне ўносяць яшчэ больш сумятні. З другой паловы XX стагоддзя, калі Вялікі нямы загаварыў, у Рыгі была адмысловая місія. Фільмаў у Савецкім Саюзе тады стваралася шмат, аднак праз палітыку дзяржавы правесці здымкі за мяжой было цяжка. А Рыга, дзякуючы сваёй гісторыі, архітэктуры і атмасферы стала ідэальным месцам для паказу на экране практычна любога заходняга горада.**

Калі казаць пра савецкае кіно, першым варта назваць легендарны фільм «Сямнаццаць імгненняў вясны» Таццяны Ліёзнавай. У эпізодзе, у якім прафесар Плэйшнер ідзе па Блюменштрасе ў Берне на канспіратыўную кватэру, ролю Берна іграе вуліца Яўніела (Новая вуліца), вядомая яшчэ з XVI стагоддзя. У гэтым жа фільме Рыга выступала і ў ролі Берліна: заалагічны музей знаходзіўся ў будынку Міністэрства фінансаў на вуліцы Мейстару, а насупраць — гасцініца «Амнунтор», у якой была прызначана сустрэча з Борманам. Калі Шцірліц ідзе па вуліцы Вальню, у вітрыне цэнтральнага універмага дапытлівы глядач можа ўбачыць латышскі надпіс — «Apavi katrai sezonai» (абутак для любога сезона).

Вялікае кінематаграфічнае мінулае мае папулярная ў турыстаў Кветкавая вуліца: яна іграе ролю італьянскага Трыеста ў фільме «На далёкіх берагах», ролю Парыжа ў карціне «Вязень замка Іф» і французскага горада Сібур у стужцы «Забойства на вуліцы Дантэ». Далей — болей: менавіта тут здымаліся эпізоды славутага серыяла «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». На экране Кветкавая вуліца становіцца лонданскай Бэйкер-стрыт, дзе знаходзіцца дом 221в, у якім жывуць галоўныя героі. Праўда, каб убачыць дзверы, што вядуць усярэдзіну, трэба зайсці ў невялікі дворык, які знаходзіцца якраз насупраць будынка з канспіратыўнай кватэрай з «Сямнаццаці імгненняў вясны».

Дзверы ў кватэру Холмса і Ватсана маюць у Рызе мясцічную славу. Сцэны ўнутры кватэры здымалі ў Ленінградзе, а дзеянне фільма адбываецца ў XIX стагоддзі, у той час як здымкі — у XX-м. Атрымліваецца, што гэтыя дзверы — прасторава-часавы партал.

У карціне «Першы дзень міру» паказана зноў вуліца Яўніела (можна нават заўважыць акно той самай канспіратыўнай кватэры) у якасці неназванага нямецкага горада. Гэтую ж вуліцу можна ўбачыць у фільме «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі»: на яе з акна глядзіць Андрэй Міронаў, які іграў ролю Джэрома. Яна ж у фільме «Ранняя ржа» і ў сярэднявечным баевіку «Слугі д'ябла» — тут Рыга іграе саму сябе.

**У фільме «Ідэальны муж» з цудоўнай парай — Юрыем Якаўлевым і Людмілай Гурчанкай — Рыга зноў ужывалася ў вобраз Лондана. Чаго варты кадр, у якім гераіня Гурчанкі, знаходзячыся ў гасцініцы на вуліцы Цірганю (у савецкі час там знаходзілася вядомая кавярня «Сіняя птушка»), глядзіць у акно і замест Домскага сабора бачыць... будынак парламента Вялікабрытаніі.**

Дзеянне карціны «Блакітны карбункул» — яшчэ аднаго фільма з Шэрлакам Холмсам, знятага на кінастудыі «Беларусьфільм», — таксама звязана з вуліцай Яўніела. Цікава, што і для «Блакітнага карбункула», і для «Прыгод Шэрлака Холмса і доктара Ватсана» музыку напісаў адзін і той жа кампазітар — Уладзімір Дашкевіч.

У гангстарскім фільме «Браты Рыка», знятым па матывах рамана Жоржа Сімянона, «Беларусьфільм» прадставіў Рыгу ў вобразе Нью-Ёрка. А ў фільме «Ідэальны муж» з цудоўнай парай — Юрыем Якаўлевым і Людмілай Гурчанкай — Рыга зноў ужывалася ў вобраз Лондана. Чаго варты кадр, у якім гераіня Гурчанкі, знаходзячыся ў гасцініцы на вуліцы Цірганю (у савецкі час там знаходзілася вядомая кавярня «Сіняя птушка»), глядзіць у акно і замест Домскага сабора бачыць... будынак парламента Вялікабрытаніі.

Дзіўная гісторыя здарылася ва ўзаемаадносінах Рыгі і Міхаіла Казакова, які зняўся ў фільме «Забойства на вуліцы Дантэ». Праз шмат гадоў, калі Казакоў як рэжысёр здымаў фільм «Пакроўскія вароты», ён не ўтрымаўся і ўставіў у свой фільм сцэну, дзе па тэлевізары паказваюць фрагмент «Забойства на вуліцы Дантэ».

Хоць лідарам па з'яўленні ў кадры з'яўляецца вуліца Яўніела, у Старым горадзе практычна няма месца, дзе ў савецкі час не здымалі б кіно: Домскі сабор, царква Пятра, Шведскія вароты, плошчы Вецпілсетас, Пілс, Ліву і, вядома, Домская плошча, розныя іншыя вулачкі. У цэлым я налічыў каля сарака фільмаў, але, хутчэй за ўсё, гэта няпоўны спіс.

З роляў Рыгі можна згадаць Стакгольм («Пасол Савецкага Саюза»), Капенгаген («Тайна Снежнай каралевы»), міфічны нямецкі горад Альтшат у фільме Рыгора Аляксандрава «Сустрэча на Эльбе» з Любоўю Арловай у ролі амерыканскай журналісткі. А фільм «Белыя званочкі», зняты на Рыжскай кінастудыі па сцэнарыі Герца Франка ў 1961 годзе, у 1995-м у Клермон-Феране (Францыя) быў уключаны кінакрытыкамі ў спіс ста найлепшых кароткаметражных фільмаў усіх часоў.

У 2005 годзе англійскі рэжысёр Дэйв Мур у пошуках месца для здымак фільма «Уоліс і Эдуард» (пра гісторыю кахання старэйшага сына караля Георга V да замужняй прыгажуні Уоліс Сімпсан) выбірае Рыгу. Апошнім часам тут здымаліся расійскія фільмы і серыялы («Поп», «Чырвоная капэла»), працавалі кінематаграфісты з Індыі («Агент Вінод», «Флаш і Вані»), Швецыі («Рыжскія сабакі»), Германіі («Блакіт неба»), ЗША («Дзеці Ірэны»), Карэі («Мой шлях») і з іншых краін.

Так ці інакш, Рыга — не толькі кінаактрыса на экране, але і сучасная еўрапейская сталіца, вартая вочнага знаёмства.

**Сяргей ІВАНЧАНКА, рыжанін у чацвёртым пакаленні.**
*г. Рыга.*



Кветкавая вуліца, яна ж Бейкер-стрыт («Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана», СССР, 1979—1986 гг.)



Акно канспіратыўнай кватэры па Блюменштрасе ў Берне («17 імгненняў вясны», СССР, 1973 г.), яна ж вуліца Яўніела (Новая вуліца).



Нью-Ёрк у версіі «Беларусьфільма» («Браты Рыко», СССР, 1980 г.), або рыжская вуліца Зіргу.

# Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

*Агуркі ў адкрытым грунце не фарміруюць, а раскладваюць акуратна плеці і прышпільваюць іх да зямлі.*

## ЦЫРУЛЬНЯ ДЛЯ АГУРКА

**Атрымаць добры ўраджай агуркоў немагчыма без фарміравання раслін — своечасовага ўкарочвання бакавых парасткаў. Пасля такой «стрыжкі» агурочныя расліны будуць не толькі лепш развівацца і пладаносіць, але і менш пашкоджвацца грыбковымі хваробамі.**

### У цяпліцы



Калі вы хочаце збіраць агуркі ў сваёй цяпліцы да восені, дапамажыце вырасці ім спачатку на галоўным сцябле, а затым на бакавых парастках. Для гэтага ў пазухах ніжніх трох-чатырох лістоў выдаліце ўсе кветкі і бакавыя парасткі. Самі лісты не чапайце. У далейшым па меры росту галоўнага сцябла рэгулярна раз на тыдзень прышчыпвайце бакавыя парасткі — да вышыні аднаго метра пакідайце на іх 1-2 лісты і адзін плод, вышэй; да 1,5 м — 2-3 лісты і два плады, далей — 3-4 лісты і тры плады.

### На шпалеры

Шпалерны спосаб вырошчвання агуркоў мае шэраг пераваг перад вырошчваннем іх проста на градцы. Па-першае, расліны асвятляюцца сонцам раўнамерна, лепш праграваюцца, ствараючы адначасова цень пад покрывам сваіх лісцяў, дзе вісяць і наліваюцца плады. Па-другое, такі спосаб спрыяе атрыманню больш высокага ўраджаю агуркоў добрага смаку, таму што ў агурочных раслін ёсць цікавая асаблівасць — яны цягнуцца да святла, падстаўляючы пад сонечныя прамяні лісце, і ў той жа час хаваюць у цень свой плод.

Калі шпалера большая за 2 м, галоўнае сцябло звычайна прышчыпваюць ля самага яе верху, а калі шпалера ніжэйшая, галоўнае сцябло закручваюць уздоўж гарызантальнага дроту і праз 20-30 см прышчыпваюць або накіроўваюць парасткі ўніз на 50 см.

Пашкоджанае хваробамі лісце, парасткі, якія адпладаносілі ці засохлі, зразаюць вострым нажом або нажніцамі, не пакідаючы пянькоў. Лісце і парасткі лепш абрэзаць толькі ў першай палове дня, каб да вечара ранкі ўжо падсохлі.

Калі расліны здаровыя, то на бакавых плецях вышэй 1,5 м можна за кожным лістом пакінуць другасны парастак галінавання, а калі ўтворыцца адзін ліст і адна завязь, прышчыпнуць гэты парастак.

Пажоўклае здаровае лісце выдаляць не трэба. А каб ніжнія лісты не жаўцелі, пазбягайце зацянення расліны ўверсе. Аднак калі шацёр з лісця ўсё ж такі ўтварыўся, то частку іх, нават калі яны буйныя і зялёныя, давядзецца зрэзаць.

Вядома, ніхто не спрачаецца, што прыгажосць — вялікая сіла. Аднак пасля наведзення гэтай самай прыгажосці не забудзьцеся напаіць агурочныя расліны, бо ад гэтага залежыць ураджай. Дарэчы, па знешнім выглядзе раслін можна вызначыць, якіх элементаў сілкавання ім не хапае.

Пры недахопе азоту жоўкне ніжняе лісце, стрымліваецца рост бакавых парасткаў, агуркі завастраюцца долу. Пры недахопе фосфару лісце драбнее, становіцца цёмна-зялёным і хутка засыхае. Пры недахопе калію па краі ніжняга лісця з'яўляецца светлая аблямоўка, а агуркі набываюць грушападобную форму. Так што калі вашы зялёныя гадаванцы ў чымсьці маюць патрэбу, акажыце ім хуткую дапамогу.

- **ПАРАДЫ БЫВАЛЫХ**

*«Ёсць погляд, што, калі зацвітаюць расліны бульбы, трэба зрэзаць кветкі, тады клубні будуць буйнейшымі. Няўжо гэта праўда?»*

Сапраўды, выдаленне кветак з раслін спрыяе павелічэнню ўраджаю бульбы. Паколькі ўтварэнне клубняў адбываецца ў перыяд цвіцення, то ў гэты час часцей рыхліце глебу і хоць бы зрэдку палівайце пасадкі бульбы, асабліва калі стаіць гарачае надвор'е. Усе гэтыя меры дазволяць павялічыць ураджай на 30-40%.

## ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЛІПЕНЬ

***6 ліпеня, серада.*** Неспрыяльны час для наведвання цырульні. Нават пры штодзённым галенні можна параніцца.

***7 ліпеня, чацвер.*** Стрыжка можа сапсаваць настрой і прынесці дыскамфорт, укладку лепш рабіць звычайную.

***8 ліпеня, пятніца.*** Спрыяльны час. Добра спрабаваць рабіць новыя стрыжкі, афарбоўваць валасы і рабіць хімічную завіўку.

***9 ліпеня, субота.*** Па магчымасці адмоўцеся ад паходу ў цырульню. А вось звычайны догляд будзе добра ўспрыняты валасамі, асабліва пажыўныя маскі.

***10 ліпеня, нядзеля.*** Стрыжка можа прывесці да канфліктаў.

***11 ліпеня, панядзелак.*** Сёння можна стрыгчыся, рабіць мяккае меліраванне, хімічную завіўку. Валасы могуць быць сухаватымі, таму добра было б падтрымаць іх маскамі, якія ўвільгатняюць.

***12 ліпеня, аўторак.*** Сёння крытычны дзень, у які неспрыяльная не толькі стрыжка, але і любыя дзеянні з валасамі.

***13 ліпеня, серада.*** Неспрыяльны для стрыжкі дзень. Валасы будуць непаслухмянымі, як дубцы.

***14 ліпеня, чацвер.*** Выдатны дзень для стрыжкі і догляду за валасамі. Добра возьмецца хімічная завіўка ці фарба.

***15 ліпеня, пятніца.*** Дзень неспрыяльны для кардынальнай стрыжкі, але догляд за валасамі прынясе спрыяльны эфект. Можна рабіць пажыўныя маскі, валасы потым будуць добра ляжаць.

***16 ліпеня, субота.*** Час падыходзіць для стварэння прыгожых мадэльных стрыжак.

***17 ліпеня, нядзеля.*** Выдатны дзень для наведвання цырульні. Валасы пасля стрыжкі добра лягуць, форма будзе радаваць вока.

***18 ліпеня, панядзелак.*** Стрыжка непажаданая. Валасы можна пашкодзіць так, што яны доўга будуць хварэць.

***19 ліпеня, аўторак.*** Неспрыяльны дзень для наведвання цырульні.

***20 ліпеня, серада.*** Стрыгчыся катэгарычна не рэкамендуецца з-за неспрыяльнага ўплыву на здароўе.

***21 ліпеня, чацвер.*** Стрыжка ў гэты дзень нясе страты і небяспеку. Магчыма пагаршэнне здароўя валасоў і арганізма ў цэлым. Не рызыкуйце!

***22 ліпеня, пятніца.*** Сёння можна стрыгчыся, калі ёсць крайняя неабходнасць. Валасы могуць дрэнна легчы, але ў цэлым шкоды не будзе.

***23 ліпеня, субота.*** Сёння ад наведвання цырульніка лепш адмовіцца.

***24 ліпеня, нядзеля.*** Добры дзень для стрыжкі. Прычоска захаваецца надоўга.

***25 ліпеня, панядзелак.*** Пасля наведвання цырульні можна разлічваць на прыгожы знешні выгляд і поспех у справах.

***26 ліпеня, аўторак.*** Стрыжка ў гэты дзень паказана для людзей хворых і слабых.

***27 ліпеня, серада.*** Сёння добра стрыгчыся, фарбаваць валасы і рабіць хімічную завіўку, але неабходна ўлічыць, што валасы менш успрымальныя да ўздзеяння, чым звычайна.

***28 ліпеня, чацвер.*** Пасля стрыжкі валасы будуць непаслухмянымі.

***29 ліпеня, пятніца.*** Дзень не падыходзіць для стрыжкі. Валасы дрэнна ўспрымаюць догляд і лячэнне, лепш пакінуць іх у спакоі.

***30 ліпеня, субота.*** Плануйце стрыжку на сёння, дзень вельмі ўдалы!

***31 ліпеня, нядзеля.*** Спрыяльны дзень для стрыжкі. Створаная прычоска захаваецца надоўга.

# Самае цікавае яшчэ наперадзе

**Сёння ў Ліёне матчам зборных Уэльса і Партугаліі адкрыецца паўфінальная частка чэмпіянату Еўропы. Заўтра ў Марселі згуляюць каманды Францыі і Германіі. Мы прывядзём некалькі цікавых фактаў пра ўдзельнікаў стадыі 1/2 Еўра.**



- Самы малады гулец партугальскай зборнай, паўабаронца Рэнату Санчэш, стаў аўтарам рэкорду фінальных турніраў чэмпіянатаў Еўропы. У чвэрцьфінальным матчы супраць каманды Польшчы ён зраўняў лік на 33-й хвіліне і стаў самым юным гульцом, які вызначыўся на Еўра — у 18 гадоў і 317 дзён.
- Асноўны час пяці матчаў запар з удзелам зборнай Партугаліі завяршыўся ўнічыю. У групавым турніры сёлетняга першынства партугальцы згулялі ўнічыю з Ісландыяй (1:1), Аўстрыяй (0:0) і Венгрыяй (3:3). У 1/8 фіналу адолелі Харватыю ў дадатковы час (1:0), а ў чвэрцьфінале Польшчу — па пенальці (5:3).
- У плэй-оф партугальцы ўсё ж такі двойчы выйгралі. І ў абодвух выпадках вырашальныя галы забіў Рыкарду Куарэжма: вароты Харватыі ён паразіў на 117-й хвіліне, а з Польшчай рэалізаваў вырашальны, пяты пенальці.
- Для Крышціяну Раналду паўфінал стане 20-м матчам у фінальных турнірах чэмпіянатаў Еўропы. Калі ён выйдзе на поле, то ў любым выпадку застанецца рэкардсменам і па выніках гэтага турніру (у актыве найбліжэйшага праследніка немца Бастыяна Швайнштайгера 17 сустрэч). Раналду ўпэўнена лідзіруе і па колькасці праведзеных на полі хвілін (1680).
- Зборная Уэльса — адзіны паўфіналіст, які ўжо прайграваў на турніры (1:2 англічанам у 2-м туры групавога этапу), але пры гэтым і адзіная каманда сярод чатырох найлепшых, якая ні разу не згуляла ўнічыю.
- Рэкордная сухая серыя Мануэля Ноера са старту чэмпіянату Еўропы склала 437 хвілін. Прычым галкіпер зборнай Германіі па-ранейшаму не прапусціў ніводнага гола з гульні (толькі з 11-метровай адзнакі).
- Зборная ФРГ/Германіі 9-ты раз прабілася ў чацвёрку найлепшых камандаў чэмпіянату Еўропы. Дарэчы, на другім месцы зборная СССР/Расіі (6 выхадаў у паўфінал). Па 5 разоў гэта ўдавалася камандам Партугаліі і Францыі.
- Антуан Грызман, забіўшы 100-ты гол на Еўра-2016, стаў аднаасобным лідарам у спрэчцы бамбардзіраў (4 мячы) і паказаў другі вынік сярод французскіх гульцоў на адным турніры. Больш за яго змог забіць толькі Мішэль Плаціні — таксама на хатнім першынстве кантынента ў 1984 годзе (9 галоў).
- Французская зборная стала лідарам турніру па колькасці дубляў (2). Прычым бамбардзіры «трохколерных» адзначыліся ў абодвух матчах плэй-оф: у 1/8 фіналу два галы забіў Грызман, у чвэрцьфінале — Аліўе Жыру.
- Дзякуючы буйной перамозе над Ісландыяй зборная Францыі стала найлепшай камандай на турніры па розніцы мячоў — «+7» (11 забітых і 4 прапушчаных).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

**6 ЛІПЕНЯ**



**1851** год. Нарадзіўся (г. Мінск) Янка Лучына (сапр. Неслухоўскі Іван Люцыянавіч), беларускі паэт. У 1877 годзе скончыў Пецярбургскі тэхналагічны інстытут. Пісаў на беларускай, рускай і польскай мовах. Паэзія Лучыны паклала пачатак беларускай філасофскай лірыцы. Аўтар паэмы «Паляўнічыя акварэлі», брашуры «З крывавых дзён» (аб паўстанні 1863-1864 гг. на Міншчыне), зборніка «Паэзія». Збіраў беларускі фальклор, у творчасці выкарыстаў народную паэтыку. Значная частка лірычных твораў лічыцца страчанай.

**1885** год. Луі Пастэр паспяхова выпрабаваў вакцыну супраць шаленства на 9-гадовым хлопчыку Жазэфу Майстэра, якога ўкусіў хворы сабака.

**1941** год. Урад Беларусі накіраваў у акупаваныя ворагам раёны 29 партызанскіх атрадаў і груп (460 чалавек); здзейснены контрудар войскаў 20-й савецкай арміі па 3-й танкавай групе нямецкіх войскаў у раёне гарадоў Лепель — Сянно.

**Было сказана**

**Мікола АРОЧКА, паэт:**
*Рака жыцця згубіла б воблік свой,*
*Калі б не знала*
*Самаачышчэння.*

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 4.47 | 21.42 | 16.55 |
| Віцебск | — 4.28 | 21.39 | 17.11 |
| Магілёў | — 4.37 | 21.32 | 16.55 |
| Гомель | — 4.42 | 21.19 | 16.37 |
| Гродна | — 5.04 | 21.55 | 16.51 |
| Брэст | — 5.13 | 21.47 | 16.34 |

### Месяц

*Маладзік 04.07—11.07.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

### Імяніны

***Пр.*** *Соф'і, Ульяны, Антона, Арцёма, Барыса, Генадзя, Дзяніса.*
***К.*** *Дамінікі, Эдварда.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Я паіла яго тры дні, а пасля прыцягнула ў ЗАГС і кажу:
— Мы на пошце, распішыся, табе бандэроль прыйшла...

**Як казаў адзін дэрматолаг: «Свярбіць правая далонь — да грошай, левая — да іх адсутнасці, абедзве — грыбок».**

Жонка — мужу:
— Ну, калі ты ўжо на дачы ў прыбіральні дзверы паставіш?
— А што там красці?!

**Узяў жонку на рыбалку і ўпершыню прыехаў з рыбалкі чысты, цвярозы і з рыбай!**




Малюнак Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА і Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2654.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 5 ліпеня 2016 года.